# Выкарыстанне камплекта апорна-аналітычных табліц

**■ Зрокавая нагляднасць у моўным развіцці малодшых школьнікаў адыгрывае важную ролю. Значнае месца ў сістэме навучання займаюць табліцы. Менавіта яны з'яўляюцца адным з асноўных сродкаў нагляднасці пры засваенні дзецьмі граматычнага матэрыялу. На розных этапах фарміравання паняццяў прымяненне нагляднасці (у прыватнасці, табліц, гл. с. 3 вокладкі) мае розныя мэты. На пачатковым этапе азнаямлення з прыметамі паняцця табліцы выкарыстоўваюцца з мэтай дакладнага прад'яўлення прымет (першасная функцыя нагляднасці). У далейшым, пасля выдзялення прымет паняцця, табліцы выкарыстоўваюцца з мэтай абагульнення абстрагаваных прымет, устанаўлення паміж імі сувязі (другасная функцыя нагляднасці). Прадэманструем, як дапамагаюць табліцы пры вывучэнні розных часцін мовы.**

### НАЗОЎНІК. Вывучэнне скланення назоўнікаў у IV класе

Склон — катэгорыя сінтаксічная. Засваенне склону заснавана на разуменні вучнямі сувязі слоў у сказе. Пры знаёмстве са змяненнем назоўнікаў па склонах дзеці запамінаюць назвы склонаў, вучацца распазнаваць склон па пытанні, прыназоўніку і ролі назоўніка ў сказе. Вывучэнне скланення назоўнікаў у IV класе мэтазгодна арганізоўваць пры дапамозе табліц. Аднак непажадана пачынаць працу адразу па гатовай табліцы. Можна падвесці вучняў да працы з таблiцай "Склоны назоўнікаў" праз знаёмства з мастацкім тэкстам, у якім адно слова ўжываецца ва ўсіх склонах.

У IV класе вучні знаёмяцца з трыма тыпамі скланення назоўнікаў. Вывучэнне гэтай тэмы мэтазгодна пачаць з аналізу табліцы "Тры скланенні назоўнікаў". Трэба прапанаваць школьнікам параўнаць склонавыя канчаткі назоўнікаў і адказаць, чаму і як можна падзяліць назоўнікі на тры групы.

Пры знаёмстве са змяненнем назоўнікаў па склонах неабходна сфарміраваць у дзяцей навыкі правапісу склонавых канчаткаў (з апорай на табліцу) і навучыць свядома выкарыстоўваць назоўнікі ў розных склонах. Пры аналізе табліцы "Назоўнікі 1-га скланення" звяртаецца ўвага на тое, што гэтыя назоўнікі маюць аднолькавыя канчаткі ў форме давальнага і меснага склонаў. Пры аналізе табліцы "Назоўнікі 2-га скланення (мужчынскі род з нулявым канчаткам)" засяроджваецца ўвага на тым, што назоўнікі 2-га скланення мужчынскага роду, якія абазначаюць жывыя прадметы, маюць аднолькавыя канчаткі ў форме роднага і вінавальнага склонаў, а назоўнікі, якія абазначаюць нежывыя прадметы, — у назоўным і вінавальным склонах. Пры аналізе табліцы "Назоўнікі 2-га скланення (ніякі род)" звяртаецца ўвага на тое, што гэтыя назоўнікі маюць аднолькавыя канчаткі ў форме назоўнага і вінавальнага склонаў. Пры аналізе табліцы "Назоўнікі 3-га скланення" засяроджваецца ўвага на тым, што гэтыя назоўнікі маюць аднолькавыя канчаткі ў формах назоўнага і вінавальнага склонаў, а таксама ў формах роднага, давальнага і меснага склонаў.

Пры аналізе табліцы "Скланенне назоўнікаў у множным ліку" ўвага звяртаецца на тое, што адушаўлёныя назоўнікі маюць аднолькавыя канчаткі ў форме роднага і вінавальнага склонаў, а неадушаўлёныя — у форме назоўнага і вінавальнага склонаў.

Вывучэнне тэмы **"Тры скланенні назоўнікаў"** можна спланаваць так.

Дзецям прапануецца разгледзець табліцу і параўнаць склонавыя канчаткі назоўнікаў:

№ 5

**Тры скланенні назоўнікаў**

| Склон | Пытанні | 1-е скланенне ж. р. (-а, -я) | 2-е скланенне м. р. ([ ]), н. р. | 3-е скланенне ж. р. ([ ]) |
|---|---|---|---|---|
| Назоўны | *хто?* *што?* | матул[я] хат[а] | хлопчык[ ] пол[е] | мыш[ ] радасць[ ] |
| Родны | *каго?* *чаго?* | матул[і] хат[ы] | хлопчык[а] пол[я] | мыш[ы] радасц[і] |
| Давальны | *каму?* *чаму?* | матул[і] хац[е] | хлопчык[у] пол[ю] | мыш[ы] радасц[і] |
| Вінавальны | *каго?* *што?* | матул[ю] хат[у] | хлопчык[а] пол[е] | мыш[ ] радасць[ ] |
| Творны | *кім?* *чым?* | матул[яй] хат[ай] | хлопчык[ам] пол[ем] | мышш[у] радасц[ю] |
| Месны | (пры) *кім?* (аб) *чым?* | (пры) матул[і] (аб) хац[е] | (пры) хлопчык[у] (аб) пол[і] | (пры) мыш[ы] (аб) радасц[і] |

Арганізуецца аналіз табліцы па пытаннях: чаму назоўнікі можна падзяліць на тры групы? якія назоўнікі ў беларускай мове адносяцца да 1-га скланення? 2-га скланення? 3-га скланення?

Настаўнік дае кожнаму вучню картку:

| | |
|---|---|
| 1-е скл. | назоўнікі ж. р. з [а], [я] |
| 2-е скл. | назоўнікі ж. р. з [ ] |
| 3-е скл. | назоўнікі м. р. з [ ] |
| | назоўнікі н. р. з [о], [е], [а], [е] |

Пакажыце стрэлкамі, якія назоўнікі да якога скланення належаць.

Дзеці выконваюць заданнне самастойна, пасля праводзіцца калектыўная праверка складзенага апорнага сігнала. (Апорны сігнал застаецца ў вучняў.)

Педагог запісвае на дошцы назоўнікі: казуля, дзік, рысь. Затым просіць вызначыць іх скланенне.

Настаўнік дзеліць вучняў на 3 групы (па радах) і прапануе дапоўніць сказы, яія ён прадыктуе, адным з гэтых назоўнікаў:

1-я група — назоўнікам 1-га скланення;

2-я група — 2-га скланення;

3-я група — 3-га скланення.

У заапарку ёсць... *(казуля, дзік, рысь)*.

Ганначка яшчэ не бачыла... *(казулі, дзіка, рысі)*.

Дзеці падрыхтавалі пачастунак... *(казулі, дзіку, рысі)*.

У вальеры хлопчыкі і дзяўчынкі заўважылі... *(казулю, дзіка, рысь)*.

Усе любаваліся... *(казуляй, дзіком, рыссю)*.

Было добра відаць, як блішчыць поўсць на... *(казулі, дзіку, рысі)*.

Можна падказаць, што слова *казуля* будзе змяняцца так, як і слова *матуля*; слова *дзік* — як і слова *хлопчык*; слова *рысь* — як і слова *радасць*.

Калі заданне выканана, дзеці параўноваюць канчаткі назоўнікаў 1, 2 і 3-га скланення ва ўсіх склонавых формах.

Для замацавання атрыманых ведаў арганізуецца ***гульня***.

На дошцы прымацаваны назвы партоў (тыпаў скланення) і малюнкі лодак з напісанымі на іх словамі:

| 1-е скланенне | 2-е скланенне | 3-е скланенне |
|---|---|---|




Завядзіце кожную лодку ў свой порт.

Вучні па адным выходзяць да дошкі і перамяшчаюць лодку ў патрэбны порт.

Потым настаўнік раздае вучням карткі:

> Дапоўніце тэкст назоўнікамі 2-га скланення. Абазначце іх канчаткі.
>
> Недалёка ад берага м______ гайдаецца на хвалях маленькі ч______. У яго няма ве______, але ёсць доўгія вё______.
>
> Далёка ў м______ плыве вялікі к______. У яго няма ні ве______, ні вё______. Ён перамяшчаецца пры дапамозе рухавікоў і паліва.

Дзеці выконваюць заданнне самастойна, пасля праводзіцца ўзаемаправерка ў парах.

На дошцы:

*к* [ ][ ][ ] *ка*   *бар* [ ][ ][ ] *но*

*с* [ ][ ][ ][ ] *нда*   *шчы* [ ][ ][ ] *ле*

Словы для даведкі: сук, аса, гол, лава.

Падбярыце слова, якое можа быць заканчэннем першага слова і пачаткам другога ў кожным радку. Напрыклад:

*ліс* [*т*][*о*][*к*] *ар*

Вучань, які здагадаўся, якое слова трэба ўпісаць у першы прыклад, выходзіць да дошкі і запісвае гэтае слова. І г. д.

Вызначце скланенне ўсіх слоў у першым слупку. Што аб'ядноўвае словы першага слупка?

Вызначце скланенне ўсіх слоў у другім слупку. Што аб'ядноўвае словы другога слупка?

На дошцы — рэбусы:




Разгадаўшы рэбусы, дзеці вызначаюць скланенне назоўнікаў-адгадак.

Чацвёртакласнікам раздаюцца карткі з вершам:

**Злы індык**
Паглядзець рашыў Ягорка,
Хто ў бабулі на падворку.
Дзве казы, парсюк, тры гусі,
Качак сем...
— Ой-ой, баюся!
На падворку — тлум і крык:
Хлапчука прагнаў індык.
*З. Марозаў.*

Якія свойскія жывёлы былі ў гаспадарцы ў бабулі? Які род мае назоўнік *гусь* у беларускай мове? Да якога скланення адносіцца гэты назоўнік?

Упішыце назвы астатніх свойскіх жывёл у крыжаванку наступным чынам: па гарызанталі — назоўнікі 1-га скланення, па вертыкалі — назоўнікі 2-га скланення.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1 і | | | | |
| н | | | | |
| д | | | | |
| ы | | | 2 п | |
| 3 к | а | з | а | |
| | | | р | |
| | 4 г | у | с | ь |
| | | | ю | |
| 5 к | а | ч | к | а |

У працы па вызначэнні тыпу скланення назоўніка важна, каб школьнікі лаканічна даказвалі сваё меркаванне. Напрыклад: *казы* — назоўны склон *каза*, назоўнік жаночага роду, мае канчатак *-а*, значыць, адносіцца да 1-га скланення.

Пры падвядзенні вынікаў вучні паўтараюць, ад чаго залежыць падзел назоўнікаў на тры тыпы скланення; да якога тыпу скланення адносяцца назоўнікі жаночага роду з канчаткамі *-а*, *-я*; з нулявым канчаткам; якія назоўнікі адносяцца да другога скланення; як вызначыць тып скланення назоўніка ў родным, давальным, вінавальным, творным або месным склонах (з апорай на табліцу).

Урок з выкарыстаннем табліцы будзе мець відавочны эфект. На этапе вывучэння новага матэрыялу яе аналіз дапаможа заўважыць прычыну размеркавання назоўнікаў па трох тыпах скланення, прыметы назоўнікаў 1, 2 і 3-га скланення. На этапе замацавання табліца будзе добрай падказкай у выбары канчаткаў розных склонавых формаў назоўнікаў. Пры падвядзенні вынікаў урока з дапамогай табліцы можна засяродзіць увагу вучняў на тым, як вызначыць тып скланення назоўніка. Важна, каб навучэнцы засвоілі **алгарытм**, якім трэба карыстацца пры вызначэнні тыпу скланення назоўніка:

1) паставіць назоўнік у назоўным склоне адзіночнага ліку;

2) вызначыць яго род і канчатак у назоўным склоне адзіночнага ліку;

3) па родзе і канчатку вызначыць тып скланення назоўніка.

## ПРЫМЕТНІК.
### Вывучэнне скланення прыметнікаў жаночага роду

Засваенне правапісу склонавых канчаткаў прыметнікаў жаночага роду патрабуе ад вучняў карпатлівай і свядомай работы. Вялікую дапамогу ў гэтым аказвае ўменне ставіць пытанне ад назоўніка да залежнага прыметніка. Чацвёртакласнікі знаёмяцца з пытаннямі, якія ставяцца ад назоўнікаў да прыметнікаў жаночага роду ва ўскосных склонах. Звяртаецца ўвага на тое, што напісанне канчатка прыметніка правяраецца канчаткам пытальнага слова. Аднак тут, як і ў прыметніках мужчынскага і ніякага роду, у поўнай адпаведнасці з пытальным словам знаходзяцца толькі націскныя канчаткі. У ненаціскным становішчы замест гука [о] вымаўляецца [а] (пішацца літара **а** пасля цвёрдых зычных і літара **я** пасля мяккіх зычных). Важна таксама засяродзіць увагу вучняў на тым, што прыметнікі жаночага роду маюць аднолькавыя канчаткі ў формах роднага, давальнага і меснага склонаў.

Вывучэнне тэмы **"Скланенне прыметнікаў жаночага роду"** пажадана праводзіць у наступнай паслядоўнасці:

1) знаёмства са ***скланеннем прыметнікаў жаночага роду***,

2) правапіс канчаткаў прыметнікаў жаночага роду ***назоўнага склону***. Супастаўленне канчаткаў прыметнікаў ***жаночага*** і ***ніякага*** роду назоўнага склону;

3) правапіс канчаткаў прыметнікаў жаночага роду ***роднага***, ***давальнага***, ***творнага*** і ***меснага склонаў***;

4) супастаўленне і правапіс канчаткаў прыметнікаў жаночага роду ***вінавальнага*** і ***творнага склонаў***.

Знаёмства са скланеннем прыметнікаў жаночага роду мэтазгодна пачаць з аналізу табліцы.

Вучням прапануецца разгледзець табліцу "Скланенне прыметнікаў жаночага роду" і параўнаць канчаткі ў розных склонах.

## Скланенне прыметнікаў жаночага роду

№ 4

| Склон | Пытанні | Прыклады | | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | якая? | дараг\|ая\| матуля | добр\|ая\| бабуля | сін\|яя\| сукенка |
| Р. | якой? | дараг\|ой\| матулі | добр\|ай\| бабулі | сін\|яй\| сукенкі |
| Д | якой? | дараг\|ой\| матулі | добр\|ай\| бабулі | сін\|яй\| сукенцы |
| В. | якую? | дараг\|ую\| матулю | добр\|ую\| бабулю | сін\|юю\| сукенку |
| Т | якой? | дараг\|ой\| матуляй (-\|ою\|) | добр\|ай\| бабуляй (-\|аю\|) | сін\|яй\| сукенкай (-\|яю\|) |
| М. | якой? | (пры) дараг\|ой\| матулі | (пры) добр\|ай\| бабулі | (аб) сін\|яй\| сукенцы |

Р. с., Д. с., М. с. – -ой, -ай, -яй

Назавіце склонавыя пытанні прыметнікаў жаночага роду. Што падказваюць канчаткі склонавых пытанняў? У якіх склонах прыметнікі жаночага роду адказваюць на адны і тыя ж пытанні і маюць аднолькавыя канчаткі? Пакажыце ў табліцы аднолькавыя формы прыметнікаў. У якім склоне прыметнікі жаночага роду маюць варыянты канчаткаў? Назавіце гэтыя канчаткі.

На дошцы запісаны прыказкі і прымаўкі:

- Сей у добрую пару — збярэш хлеба гару.
- У добрай гаспадыні ёсць сала і масла ў скрыні.
- І пад белаю кашуляю душа бывае брудная.
- Хадзі простаю сцежкаю, то не заблудзіш.
- Ранні зайчык зубкі цярэбіць, а позні вочкі працірае.

Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць? Спішыце. Карыстаючыся табліцай, вызначце склон прыметнікаў жаночага роду, выдзеліце канчаткі. Якія канчаткі маюць прыметнікі назоўнага склону?

На дошку побач з асноўнай табліцай дадаткова прымацоўваецца табліца канчаткаў:

| Склон | Канчаткі | |
|---|---|---|
| | пасля цвёрдых зычных | пасля мяккіх зычных |
| Назоўны | *-ая* | *-яя* |

Дзецям раздаюцца карткі:

Адгадайце загадку. Вызначце род, лік і склон прыметнікаў. Дапішыце патрэбныя канчаткі прыметнікаў.

І заморск.. птушка
Паўднёв..,
І пячаць на паперы
Лілов__.

*У. Мацвеенка*





Параўноўваюцца канчаткі прыметнікаў жаночага і ніякага роду ў назоўным склоне. Звяртаецца ўвага вучняў на тое, што нельга блытаць гэтыя канчаткі.

На дошку вывешваецца памятка:

***Будзьце ўважлівыя!***

| Канчаткі прыметнікаў **назоўнага склону адзіночнага ліку** | |
|---|---|
| **ж. р.** | **н. р.** |
| ***-ая, -яя*** | ***-ае, -ое, - яе*** |

Вучням раздаюцца карткі:

Трапяткая прастора — н
цёмна-сіняе мора. е
Як жывое, да рання о е а
ўсё пульсуе ад ззяння. з р а н б
*С. Шах.*

Кудлатая, калючая,
высокая, рыпучая. с
Што восень, што вясна — а н
зялёная … . с а
*С. Шах.*

Адгадаўшы загадкі, вучні злучаюць “рассыпаныя” літары так, каб атрымаліся словы-адгадкі. Затым знаходзяць у загадках прыметнікі, вызначаюць іх род і склон, падкрэсліваюць прыметнікі жаночага роду, абазначаюць іх канчаткі.

***Самастойная работа***

На дошцы запісаны спалучэнні слоў:

Цёпл.. раніца, вялік.. радасць, сін.. паліто, апошн.. праца, сін.. кветка, вялік.. дрэва, цёпл.. малако, апошн.. заданне.

Пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў. Вызначце род, склон і канчаткі прыметнікаў. У першы слупок выпішыце спалучэнні слоў з прыметнікамі жаночага роду, у другі слупок — з прыметнікамі ніякага роду. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў. Праводзіцца калектыўная праверка выканання задання.

Пры падвядзенні вынікаў урока вучні паўтараюць, са скланеннем якіх прыметнікаў пазнаёміліся на ўроку. Знаходзяць у табліцы падказку, якой можна карыстацца пры вызначэнні склонавых пытанняў прыметнікаў жаночага роду (устанаўліваюць адпаведнасць паміж канчаткам склонавага пытання і канчаткам прыметніка). Карыстаючыся табліцай скланення, вызначаюць, якія канчаткі маюць прыметнікі жаночага роду назоўнага склону. Адказваюць, з канчаткамі якіх прыметнікаў іх не трэба блытаць.

Такім чынам, праца з табліцай на ўроку будзе мець відавочны эфект. На этапе вывучэння новага матэрыялу аналіз табліцы дапаможа выявіць

склоны, у якіх прыметнікі жаночага роду маюць аднолькавыя формы, варыянты канчаткаў, размежаваць формы вінавальнага і творнага склонаў. На этапе замацавання табліца будзе добрай падказкай ва ўтварэнні формы назоўнага склону прыметнікаў жаночага роду ў прапанаваных настаўнікам словазлучэннях і сказах. Пры падвядзенні вынікаў урока з дапамогай табліцы можна засяродзіць увагу вучняў не толькі на правапісе канчаткаў прыметнікаў жаночага роду назоўнага склону, але і на тым, як суадносяцца канчатак склонавага пытання і канчатак прыметніка жаночага роду.

## ЗАЙМЕННІК.
## Вывучэнне скланення асабовых займеннікаў

Пры знаёмстве са скланеннем асабовых займеннікаў мэтазгодна выкарыстоўваць табліцу "Скланенне асабовых займеннікаў". Дзеці часта не атаясамліваюць пачатковую форму асабовага займенніка і яго ўскосныя формы, паколькі маюць справу з суплетыўнымі асновамі. Аналіз табліцы дапаможа ўсвядоміць, што *мяне*, *мною*, *табе*, *табою*, *нас*, *вам*, *яго*, *яе*, *іх* — склонавыя формы займеннікаў *я*, *ты*, *мы*, *вы*, *ён*, *яно*, *яна*, *яны*. Азнаямленне са скланеннем займеннікаў носіць практычны характар. Яго абавязкова трэба падмацоўваць аналізам тэкстаў. Неабходна звярнуць увагу на тое, што займеннік *ты* ў родным і вінавальным склонах мае форму *цябе*, а ў давальным і месным — *табе*. Важна практыкаваць вучняў у правільным ужыванні гэтых склонавых формаў у маўленні.

Вывучэнне тэмы "Скланенне займеннікаў 2-й асобы" можна спланаваць так.

На этапе вывучэння новага матэрыялу дзецям прапануецца разгледзець табліцу скланення асабовых займеннікаў.

№ 2

**Скланенне асабовых займеннікаў**

| Склон | Пытанні | Склонавыя формы | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Адзіночны лік | | | | Множны лік | | |
| Н. | *хто?* | я | ты | ён<br>яно | яна | мы | вы | яны |
| Р. | *каго?* | мяне | цябе | яго | яе | нас | вас | іх |
| Д. | *каму?* | мне | табе | яму | ёй | нам | вам | ім |
| В. | *каго?* | мяне | цябе | яго | яе | нас | вас | іх |
| Т. | *кім?* | мной (мною) | табой (табою) | ім | ёй (ёю) | намі | вамі | імі |
| М. | (пры) *кім?* | (пры) мне | (пры) табе | (пры) ім | (пры) ёй | (пры) нас | (пры) вас | (пры) іх |

Р. с., В. с. — *цябе* Д. с., М. с. — *табе*

У якіх склонах займеннік *ты* мае аднолькавыя формы? Пакажыце іх у табліцы. У якім склоне займеннік *ты* мае варыянты канчаткаў? Назавіце гэтыя канчаткі. У якіх склонах займеннік *вы* мае аднолькавыя формы? Пакажыце іх у табліцы. У якім склоне займеннікі ўжываюцца толькі з прыназоўнікамі? Прачытайце формы меснага склону займеннікаў *ты*, *вы*. Як пішуцца прыназоўнікі з займеннікамі? (Для зручнасці працы слупкі са склонавымі формамі займеннікаў можна закрыць аркушамі паперы.)

Дзецям раздаюцца карткі з вершам:

**Ваўкавыск**

Мой любы горад Ваўкавыск,  
Табой я **ганаруся**!  
Хаджу па вуліцах адна  
І на цябе **дзіўлюся**.

Мой любы горад Ваўкавыск,  
Табе дабра **жадаю**  
І песні, вершы пра цябе  
**спяваю** і **складаю**.

*Алеся Жэбрак*  
*(Вясёлка. — 2009. — № 11. — С. 3).*

Прачытайце верш вучаніцы пра родны горад. Што вы ведаеце пра Ваўкавыск? Вусна пастаўце пытанні ад выдзеленых слоў да асабовага займенніка *ты*. Вызначце склон займенніка *ты* ў сказах. Што вы можаце расказаць пра свой родны горад (пасёлак, вёску)? Якія словы падыходзяць для яго апісання?

На дошцы запісаны пытанні:  
Чым вы любіце займацца ў вольны час?  
Ці падабаецца вам чытаць кнігі?  
Якія кнігі цікавяць вас?  
Каму з вас бацькі выпісваюць або купляюць дзіцячыя часопісы?  
Ці даводзілася вам дасылаць туды свае творы, малюнкі?  
Ці праводзілі з вамі сустрэчу члены рэдакцыі часопіса або газеты?

Вызначце склон займенніка **вы** ў пытаннях. Запішыце адказы. Знайдзіце асабовыя займеннікі ў сказах-адказах і вызначце іх асобу, лік. Вызначце склон у займенніках 1 і 2-й асобы.

Настаўнік паведамляе дзецям, што пры ветлівым звароце да незнаёмага або старэйшага чалавека трэба ўжываць займеннік *Вы* і яго склонавыя формы *Вас*, *Вам*, *Вамі*, якія пішуцца з вялікай літары.

На дошцы запісаны тэкст:

*Паважаная Марыя Васільеўна!*

*Запрашаем (В/в)ас на наш **выпускны ранішнік**. Свята адбудзецца 31 мая а дванаццатай гадзіне. Чакаем (В/в)ас у актавай зале. Будзем вельмі рады (В/в)ам.*

*Вучні 4 "А" класа.*

Якія асабовыя займеннікі ўжываюцца ў запрашэнні? Якую літару з дужак трэба ўставіць у словы? Чаму? Вызначце склон асабовага займенніка **Вы** ў сказах.

Вучні па адным выходзяць да дошкі, выціраюць непатрэбныя літары, правільна запісваюць формы асабовага займенніка ў запрашэнні.

На дошку вывешваецца схема:

**Гавары правільна**

а пятай гадзіне — у пяць гадзін

Увага вучняў звяртаецца на тое, што час, калі адбудзецца якая-небудзь падзея, у беларускай мове можа абазначацца па-рознаму. Спалучэнне слоў з прыназоўнікам **а** *(а пятай гадзіне)* характэрнае толькі для беларускай мовы, у адрозненне ад спалучэння *у пяць гадзін*, якое ёсць і ў рускай *(в пять часов)*, і ў беларускай мовах. Школьнікі могуць папрактыкавацца ў пабудове сказаў з асаблівым спалучэннем слоў беларускай мовы.

Для замацавання ведаў вучням раздаюцца паштоўкі. Настаўнік прапаноўвае напісаць запрашэнні на выпускны ранішнік іх класа для настаўнікаў музыкі, фізічнай культуры, замежнай мовы і іншых гасцей. (Кожны вучань піша сваё запрашэнне.) Праводзіцца калектыўная праверка.

Вучням раздаюцца карткі:

Раскрыйце дужкі, пастаўце займеннікі ў патрэбную форму. Прачытайце адноўлены верш.

**Дыван-самалёт**

Падышоў да бабулі  
І гаворыць Іван:  
— (Ты) расказвала казку  
Пра чароўны дыван.  
Калі вытчаш, бабуля,  
(Я) дыван-самалёт,  
То (ты) без білета  
(Я) вазьму ў палёт.

*С. Чыгрын*  
*(Вясёлка. — 2008. — № 9. — С. 18).*

Ці можна Івана назваць фантазёрам? Чаму?

На дошцы — запіс:

Цябе, табе, табой, ты, твой;  
Вы, ваш, вам, вас, вамі.

Знайдзіце ў кожным радку лішняе слова. Растлумачце свой выбар.

Вучням раздаюцца карткі:

Дапішыце патрэбныя займеннікі (**ты** або **вы**). Вызначце склон займеннікаў у кожным спалучэнні.

бачылі *(каго?)* ____  
належыць *(каму?)* ____  
забеглі *(да каго?)* да ____  
гуляе *(з кім?)* з ____  
гаварылі *(пры кім?)* пры

З двума спалучэннямі слоў на выбар складзіце і запішыце сказы.

______________________________  
______________________________  
______________________________  
______________________________

Пры падвядзенні вынікаў урока дзеці паўтараюць, са скланеннем якіх займеннікаў пазнаёміліся на ўроку.

Карыстаючыся табліцай скланення, адказваюць, пры размежаванні якіх формаў склонаў гэтых займеннікаў важна не памыліцца; па чым можна лёгка вызначыць форму меснага склону гэтых займеннікаў. Расказваюць, як пішуцца прыназоўнікі з займеннікамі; калі займеннік *Вы* пішацца з вялікай літары.

Такім чынам, урок з выкарыстаннем табліцы будзе мець відавочны эфект. На этапе вывучэння новага матэрыялу аналіз табліцы дапаможа выявіць склоны, у якіх асабовыя займеннікі маюць аднолькавыя формы, варыянты канчаткаў, размежаваць формы роднага, вінавальнага і давальнага, меснага склонаў, звярнуць увагу на правапіс прыназоўнікаў з займеннікамі. На этапе замацавання табліца будзе добрай падказкай ва ўтварэнні склонавых формаў займеннікаў у прапанаваных настаўнікам словазлучэннях і сказах. Пры падвядзенні вынікаў урока з дапамогай табліцы можна засяродзіць увагу вучняў на тым, як не памыліцца ў вызначэнні склону займенніка (асабліва пры размежаванні формаў роднага і вінавальнага склонаў, давальнага і меснага склонаў).

**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**  
дацэнт кафедры  
беларускага і рускага мовазнаўства  
факультэта пачатковай адукацыі  
БДПУ імя М. Танка,  
кандыдат педагагічных навук, дацэнт.